**На базе ўстановы адукацыі ў летні перыяд плануецца работа аздараўленчага лагера "Сонейка" з дзённым знаходжаннем дзяцей (18 дзён). Адкрываецца лагер 1 чэрвеня 2021 года. Рэжым работы: 8.30 - 16.00. Кіраўнік лагера Яцкоўская Алена Рыгораўна, настаўнік пачатковых класаў, тэл. 801716 9 20 85. Выхаванцам прапануецца шырокая праграма выхаваўчых мерапрыемстваў, якая ўключае акцыі, рухомыя гульні на свежым паветры, пазнавальныя прагулкі і прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на бяспеку жыццядзейнасці. У абавязковым парадку будуць выконвацца рэкамендацыі па папярэджанні распаўсюджвання каронавіруснай інфекцыі. Бацькоўская даплата за наведванне аздараўленчага лагера: 6-10 гадоў – 30 рублёў, 11-13 гадоў – 35 рублёў.**

**У дзіцячым аздараўленчым лагеры "Дружба" пас. Энергетыкаў кругласутачнага знаходжання.**

- 1 змена 06-19.06
- 2 змена 06-10.07
- 3 змена 07-31.07
- 4 змена 08-21.08

Дзіцячы аздараўленчы лагер «Дружба» (18 дзён) (кошт пуцёвак)

| ўзрост | Кошт пуцёўкі | сума датацыі | даплата |
|---|---|---|---|
| 6-10 гадоў | 395.00 | 215.00 | 180.00 |
| 11-13 гадоў | 405.00 | 215.00 | 190.00 |
| 14-18 гадоў | 415.00 | 215.00 | 200.00 |

**У профільным спартыўна-патрыятычным лагеры «Арляня» на базе дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Дзяржынскі раённы цэнтр турызму і краязнаўства» (12.08-29.08)**

Спартыўна-патрыятычны лагер «Арляня» (18 дзён) (кошт пуцёвак)

| ўзрост | Кошт пуцёўкі | сума датацыі | даплата |
|---|---|---|---|
| 6-10 гадоў | 215.00 | 215.00 | 0.00 |
| 11-13 гадоў | 215.00 | 215.00 | 0.00 |
| 14-18 гадоў | 215.00 | 215.00 | 0.00 |

**У профільным турысцка-краязнаўчым лагеры «Турыст» (05.07-22.07) і аздараўленчым лагеры мастацкага профілю «Арт-акадэмія» (24.07-10.08) на базе дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Дзяржынскі раённы цэнтр турызму і краязнаўства»**

Профільны турыстычны лагер «Турыст» (18 дзён);

аздараўленчы лагер з кругласутачным знаходжаннем «Арт-Акадэмія» (18 дзён)

| ўзрост | Кошт пуцёўкі | сума датацыі | даплата |
|---|---|---|---|
| 6-10 гадоў | 305.00 | 215.00 | 90.00 |
| 11-13 гадоў | 310.00 | 215.00 | 95.00 |
| 14-18 гадоў | 315.00 | 215.00 | 100.00 |

Прадпрыемствы і арганізацыі Дзяржынскага раёна прапануюць навучэнцам часовую працоўную занятасць у летні перыяд

З пералікам наяўных вакансій, відаў работ і прафесій, узроўнем аплаты, парадкам працаўладкавання можна азнаёміцца, звярнуўшыся ў аддзел занятасці насельніцтва ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Дзяржынскага райвыканкама

***Выхаваўчы план аздараўленчага лагера тут...***

**01.06.2021**

**На базе ўстановы адукацыі распачаў работу аздараўленчы лагер "Сонейка" з дзённым знаходжаннем дзяцей. У першы дзень выхаванцам была прапанавана шырокая праграма выхаваўчых мерапрыемстваў, якая ўключала прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на бяспеку жыццядзейнасці, флэш-моб акцыю "Беларусь у маім сэрцы", рухомыя гульні на свежым паветры, відэатэку.**



**05.06.2021**

Цікава і змястоўна праходзяць мерапрыемствы ў аздараўленчым лагеры. Большую частку часу выхаванцы жадаюць гуляць. Асабліва - на свежым паветры



**10.06.2021**

У аздараўленчым лагеры праведзены адзіны дзень інфармавання для выхаванцаў "ШАГ" "Школа Актыўнага Грамадзяніна" па тэме: **"Дакажам справай, што нездарма на нас спадзяецца зямля"** (да Сусветнага дня аховы навакольнага асяроддзя)

У гэтым годзе Сусветны дзень навакольнага асяроддзя прысвечаны тэме аднаўлення экасістэм і нашых адносін з прыродай: “Пераасэнсаваць. Узнавіць. Аднавіць“. Захаваць родную прыроду, чыстае паветра і карысныя выкапні для наступных пакаленняў - агульная задача ўсяго чалавецтва.



**11.06.2021**

З мэтай папулярызацыі дзяржаўнай сімволікі ў дзіцячым аздараўленчым лагеры ўстановы адукацыі праведзена патрыятычная акцыя **"Беларусь у маім сэрцы"**. У гэты ж дзень адбылося спартыўнае свята **"Лета. ЗдОрава! ЗдарОва!"**

У мерапрыемствах прынялі ўдзел ганаровыя госці: старшыня Прэзідыума Дзяржынскай раённай арганізацыі Беларускага грамадства Чырвонага Крыжа Ігнатава Вольга Віктараўна, старшыня Дзяржынскай раённай арганізацыі Беларускага грамадства Чырвонага Крыжа Буслейка Вера Барысаўна, стараста вёскі Паўлюці Шакаль Мікалай Анатольевіч. Госці уручылі дзецям спартыўны інвентар, пажадалі добрага адпачынку на канікулах. Выхаванцы аздараўленчага лагера "Сонейка" прадэманстаравалі свае спартыўныя навыкі ў конкурсах, эстафетах. Атрымалася ЗДОРАВА!



 

**21.06.2021**

У рамках Тыдня моладзі ва ўстанове адукацыі  для выхаванцаў аздараўленчага лагера праведзены Дзень здароўя і спорту "ЗдОрава! ЗдарОва!" (Фізічная зарадка)

